**Ганна Мятліцкая,**
*БДУ, Мінск*

# ТЭМА ПАЭТА І ПАЭЗІІ Ў ТВОРЧАСЦІ А. БАРСКАГА (НА МАТЭРЫЯЛЕ ЗБОРНІКАЎ «МОЙ БЕРАГ», «ЛІРЫЧНЫ ПУЛЬС»)

Мастацкі свет Алеся Барскага цікавы і адметны. Лірыка творцы адлюстроўвае розныя праявы навакольнага жыцця, натхнёная светлымі пачуццямі любові да роднага белавежскага краю, красой прыроды, каханнем, прасякнутая настроем радасці. Адной з найбольш прыцягальных для аўтара тэм з'яўляецца тэма паэта і паэзіі. Ва ўсіх сваіх зборніках вершаў ён звяртаецца да феномена паэтычнай творчасці, робіць шматлікія спробы яго спасціжэння і асэнсавання – праз раскрыццё ўнутранага свету лірычнага героя, яго роздумаў і адчуванняў, якія спрыяюць узнікненню натхнення, гаворыць пра якасць і вытокі сапраўднай паэзіі як адной з загадак быцця.

У зборніках "Мой бераг" (1975) і "Лірычны пульс" (1987) паэтычная творчасць асацыятыўна суадносіцца з хлебам (пшаніцай, зернеткам, коласам), мёдам, хараством прыроды (пракосамі – "хвалі траў пахучых і зялёных" [4, с. 67]) і многім іншым. Хлеб – аснова сялянскага жыцця, сімвал дабрабыту, спрадвечны асноўны прадукт харчавання. Для паэта верш – гэта хлеб і зямля – хлеб (верш "Нам простых праўд…"), ён з'яўляецца "хлебам горкім і салодкім, // бо ў ім сляза цалуецца з усмешкай" [4, с. 92]. Творчая дзейнасць звязваецца з пошукамі праўды: людзям мала простай праўды, яны імкнуцца да "гармоніі і ладу". Паэтычнаму слову ўласціва таямнічасць, "бяда і радасць" становяцца крыніцамі, з якіх выцякаюць шчырыя, простыя, падчас наіўныя эмоцыі душы. Так, лірычны герой прызнаецца: "О, верш! – маёй наіўнасці паводка, // у край ілюзій мая сцежка" [4, с. 92], ён шукае сваю "праўду ў зямлі і фразе". У фінале гэтага твора знаходзім цікавую метафару пра актыўную ролю паэта і верша ў праўдзівым адлюстраванні паэтычнага свету:

Паэт і верш – у праўды вечным сказе
крывы пытальнік,
просты клічнік! [4, с. 92]

На суаднясенні вобразаў пшаніцы, зернетка, коласа і паэзіі, слова, паэта пабудаваны верш "Пшаніца – рухомы падмурак…", гэтыя вобразы шчыльна ўплецены ў тканіну твора, абыгрываецца іх моцная ўзаемазалежнасць. Знаходзім і наступны аўтарскі афарызм: "Колас ніколі не журыць // сэрцы сялянскіх паэтаў" [4, с. 41].

У знешне простым, але глыбокім вершы "Расклявалі сонца пчолы…" створаны малюнак вырабу пчоламі мёду: плённай руплівай

працы па атрыманні з сонца мёду (пчолы "чаруюць у келлях-святынях" [4, с. 38], адзначаецца таемнасць дзейства і яго святасць). Паэзія, як і мёд, адпаведна залежыць ад сонца, добрага надвор'я і шчырасці працы. Гэты верш відавочна ўтрымлівае рысы міфалагізму. Апісанне працы пчол аўтар завяршае малітвай:

Малюся:
дай, неба, пагоду,
дай сонца пчолам,
дай пчолам лёту.
Больш будзе мёду,
больш будзе паэтаў [4, с. 38].

Паэтычную творчасць А. Барскі асацыятыўна суадносіць з хараством ("Верш – згартанне хараства ў пракосы…"). У яго ўспрыняцці верш – гэта не толькі "ружы жнівеньскіх аблокаў, // у анёльскай рэзблены майстэрні" [4, с. 67]. Вясновыя кветкі, жыта, якое красуе, радасць росных раніц, радасць на вуснах сакавітых і ў сэрцах маладых – усё гэта праявы прыгажосці жыцця. Паэзія для лірычнага героя – "шчасце ў рыфмах" [3, с. 117].

Паэт вобразна расказвае пра свой творчы стан, у якім адначасова праяўляюцца слодыч і горыч, радасць і мука, узлёты і падзенні:

А сябе парадуеш, памучыш,
як за́баўку, знімеш з неба зорку,
узляціш, і звалішся на крушні,
і нап'ешся асалоды горкай [4, с. 67].

У разгорнутай метафары верш-ружы таксама выкарыстана антытэза: "калі лічыш прыгажосць пялёсткаў, // палічы у ім таксама церні" [4, с. 67].

Матыў знітаванасці з роднай прыродай, якая дорыць і адпачынак, і натхненне, знаходзім у вершы "Колас". Сваім узнёслым душэўным станам лірычны герой імкнецца з удзячнасцю падзяліцца з коласам: "О, мой коласе добры, мой лекару вечны! // Ад хвароб і тугі ты лячыў нас і лечыш; // <…> Глянь навокал сябе: там прасторы, / прасторы, // Толькі хваля плыве праз зялёнае мора; // Я ляжу тут на дне, я ляжу звышшчаслівы, // Апрануўшыся ў песню – зялёнае дзіва" [3, с. 14]. Песня каласоў у падтэксце твора гарманічна зліваецца са спеўным настроем душы. Паэт бачыць і чуе навакольную прыроду, адчувае сваю далучанасць да яе, знітаванасць з ёй. Да яго ў час прагулкі прыходзіць паэтычнае натхненне: "На свеце толькі я і слова" [3, с. 88].

Узнікненне творчага настрою перададзена праз метафару "Бывае, што ў снежні прыйдзе май". У аднайменным творы ("Бывае, што ў снежні…") выкарыстаны адухоўленыя вобразы маю, сонца, якія размаўляюць з лірычным героем і ўплываюць на стан яго душы. Калі

прыйшло натхненне, “у сэрца глянь, тады // яно шырэй грудзей, // у ім змясціўся цэлы свет, // і ўсё з-за паэзіі і вачэй, // валошкавых вачэй дзявочых” [4, с. 91]. Нават у снежні чалавек можа адчуць, як “сонца ўзыйдзе сярод ночы”.

Адна з крыніц творчасці – каханне, адзначана ў вершы “Замест пасагу…”. Усё змянілася ў жыцці лірычнага героя, калі каханая з’явілася ў ягонай хаце, тады “верш родзіць кожны дзень” [3, с. 118]. Узаемасувязь паэзіі і кахання, радасці жыцця і творчасці асэнсоўваецца і ў вершы “А калі ў каханне шчырае не верыш…”. Менавіта каханне і вера ў яго абумоўліваюць успрыманне рэчаіснасці:

А калі ў каханне шчырае не верыш,
Дык не зложыш песні ты аб ім праўдзівай.
Светлае здавацца будзе табе шэрым,
І ніяк не зможаш зразумець шчаслівых [3, с. 117].

Сябе і каханую А. Барскі параўноўвае з песнямі: “Мы, як дзве песні, // Мы, як два гімны” [3, с. 102]. Аўтар называе тое, што патрэбна закаханым для шчасця. Пры гэтым ён вылучае прастату як важную якасць лірычнай паэзіі: “Трэба слоў простых // І вершаў простых” [3, с. 102].

Стварэнне верша параўноўваецца са знясільваючай працай – малацьбой у жорнах збожжа. Творчы чалавек даволі часта пакутуе з-за сваіх твораў: яго многія крытыкуюць за іх, папракаюць. А. Барскі раіць паэту не чакаць вялікай удзячнасці, а імкнуцца быць самім сабой:

Ты не шукай, аднак,
Узнагароды
Ці павагі,
А толькі думай,
Як сабе не здрадзіць [3, с. 127].

Для стварэння паэтычных радкоў патрэбны адпаведныя словы і эмоцыі (“шаленства ўсё любіць”). Лірычны герой верша “Вецер згінаў у дол…” звяртаецца да лёсу:

О, лёсе, дай мне слоў,
Так простых, як ралля,
І навучы мяне
Шаленству ўсё любіць
І дай мне жэст і густ
Гароха-караля [3, с. 67].

Вобраз караля Гароха мае фальклорныя вытокі. Валодаючы велічнымі якасцямі караля, лірычны герой імкнецца “стаць рабом // Валошак і рабін” [3, с. 67].

Знаходзім у А. Барскага і метафару “Паэт – удовін сын” [3, с. 127]. Аднайменны верш выяўляе эстэтычныя погляды аўтара. У назве гэтага твора абыгрываецца вобраз героя беларускай чарадзейнай

казкі, у якой, як вядома, шчаслівы фінал: дабро перамагае зло. Аднак у лірычным творы А. Барскага адзначана, што паэт не можа быць шчаслівым, ён “горкі працаўнік, // А не герой удалы”.

Некаторыя з вершаў са зборніка “Лірычны пульс” прысвечаны асэнсаванню лёсу творчага чалавека. Так, у вершы “Паўлюк Багрым”, які быў змешчаны і ў зборніку “Белавежскія матывы”, гаворыцца, што гэты паэт не стане мёртвым – “паплыве над роднай планетай // Звонкая песня свабоды” [3, с. 34].

Паэт задумваецца, якім павінен быць верш, што для яго самае важнае. Адказ на гэтыя пытанні знаходзім у творы “Імкненне” [3, с. 129; 1, с. 152]: верш павінен быць *прыгожым*, як неба бязмежжа, мары дзяўчыны, спеў Белавежы; *простым і шчырым*, як сонца праменні, слёзы дзіцяці, маці жаданні; *балючым*, як лёт бліскавіцы, роспач агоніі, мукі канання; *справядлівым*, як песні сумлення, мара шчаслівых, сонца гарэнне. Гэты твор мае амебейную кампазіцыю: у другой частцы кожнай страфы прыводзяцца паняцці, з якімі асацыятыўна суадносіцца творчасць.

У вершы “З рук сонца ўзялі мы песню…” таксама адзначаецца шчырасць як адна з галоўных якасцей песні, якая “нам рукі злагодзіла, // яна нам сэрцы пашырыла, // яна нам пахне выраем”. Песняй людзі расквечваюць жыццё, “умайваюць” зямлю. Нам сустрэліся два варыянты фіналу гэтага верша: “Мы песню цёплую, цёплую // з рук маткі-сонца маем” [2, с. 29] і “Мы песню цёплую-цёплую // з рук маці-Радзімы маем” [4, с. 70].

У вершы “Зайграйце песню, лірнікі…” паэт просіць музык зайграць песню, “каб аджыло мінулае // У віхры струн <…> Каб старына пайшла // У скокі” [3, с. 123]. Творца ўяўляе, якімі былі песні лірнікаў, заклікае: “Зайграйце песню, лірнікі, // Плячыстую, // Агністую, // Бунтарную, // Змагарную, // Задорную // І непакорную” [3, с. 123]. Эпітэты надаюць вершу рытмічнасць, дынамічнасць і служаць паглыбленню зместу.

Белавежскі край адметны сваёй песеннасцю. Гэты матыў яскрава раскрываецца ў вершы “Над чубам заціхшым магутнага дуба…” (“Белавежская песня”). Лірычны герой зазірнуў у свой “паэтычны <…> кубак – // А зоры ў ім звоняць шапэнаўскім скерца”. Ён чуе, што “ціха спявае <…> край Белавежскі”, уся прырода спявае: пялёсткі вішань, чарэшань, дрыжанне зор, бярозы і сосны... Вобраз песні адухоўлены – “песня бяжыць у лугі і у нівы <…> на момант застыне <…> ды зноў заквітнее на вуснах дзявочых” [4, с. 29].

Падслуханыя ў прыроды песні могуць быць і мастацкай дэталлю, як, напрыклад, у вершах “Сказаў раз Геракліт…”: “Я чую песню у трысці” [3, с. 74]; “Не шукай на ўзбярэжжы…”: у ракавінах шчасця гучыць песня мора [3, с. 77].

А. Барскі лічыць вершы “паэтычнымі, лірычнымі звышматэрыямі” [3, с. 130]. Яго лірычны герой-паэт суадносіць сябе з птушкай – “пералётным жоравам”: “на крылах песні узлячу // І не вярнуся!” [3, с. 131]

Лірычны герой твораў А. Барскага адчувае сваю раздвоенасць паміж небам (зоркамі зеленавокімі) і зямлёй (верш “Сёстры мае высокія…”, які ўспрымаецца як “пейзаж душы”). Ён – брат зорак, з якімі звязана ўзнікненне натхнення: “вы рукі мае ўзнімалі // да паэтычных даляў. // Вы клікалі брата далёка, // вы клікалі брата высока, // і плаваў я, плаваў у шырах, // імкнуўся ў далёкі вырай // і зноў на зямлю вяртаўся” [4, с. 40]. Сувязь творчага чалавека з зоркамі, адчуванне кроўнай злучанасці з імі – прыкметы міфалагізму. Анафарычныя паўторы сведчаць пра ўплыў фальклорнай паэтыкі.

Верш “Праз сон сівы…” – таксама “пейзаж душы”, адлюстроўвае ўнутраны стан лірычнага героя, які нібы “раствараецца” душой у прыродзе:

Я неабдымны,
Я ўсясільны.
І мая старасць маладзее [3, с. 88].

У форме лірычнай споведзі напісаны верш “Спяшаўся, мабыць, час…”. Лірычны герой даверліва раскрывае чытачам свой унутраны свет і ацэньвае зробленае, адзначае, што яго кліча ўдаль надзея: “Спяшаўся, мабыць, час, // Таму спазніўся я. // І зроблена не ўсё, // І зроблена не так. // Гарыць, гарыць // Далёкі той маяк, // І кліча, кліча ўдаль // Маёй надзеі птах” [3, с. 128]. А. Барскі падкрэслівае няспыннасць творчай працы: заўсёды ў паэта ёсць патрэба пісаць, жаданне дзейнічаць, быць актыўным (“Пакуль яшчэ мая // Рука пяро бярэ – // У сэрцы, значыць, ёсць // І песня, і сляза” [3, с. 128]).

У вершы “Майго дзяцінства…” знаходзім аўтарскі аповед пра дзіцячыя і юнацкія гады і Белавежу – край яго маленства. У дзяцінстве хлапчук хадзіў босы, ён быў не аддзелены ботамі ад зямлі і камення, промняў і расы:

Усё з зямлі я ўвабраў
у сваю кроў,
калі хадзіў без ботаў
сярод палёў,
сярод вясны і лета
калі хадзіў сярод
людзей,
дзе кожны быў –
паэтам [4, с. 54].

Будучы паэт захапляўся прыгажосцю навакольнай прыроды, ён бачыў, што простыя вясковыя людзі валодаюць дарам паэтычнага ўспрымання свету – людзі з паэтычнай душой (падобны матыў

сустракаецца і ў лірыцы Я. Янішчыц).

Праз гады творца асэнсоўвае ўзаемасувязь паміж паэтам і землякамі як паэтам і чытачамі. Так, у вершы “Стаю пад небам…” праявіўся радасны аўтарскі настрой, бо творы паэта чытаюць яго землякі: “Дык як жа сэрцу не квітнець // Сланечнікам і вершам?” [3, с. 122].

Разуменне і асэнсаванне сувязі творчасці з роднай зямлёй знаходзім у вершы “Адну толькі маю зямлю…”. Родная зямля – крыніца творчасці, менавіта яна дае сілы, натхненне. Паэт успрымае зямлю “наіўнай, нібы дзіця”. Усе праявы роднага краю блізкія і дарагія яго сэрцу: “Малюся лясному галлю, // П’янею ад песні трысця”, з зямлі “мая песня і сон // І спеласці шчодры ўмалот” [3, с. 26]. Рысы міфалагічнага светаадчування лірычнага героя (знітаванасць чалавека з наваколлем, прыродным жыццём, яго законамі) выявіліся ў аўтарскім адказе на пытанне, што значыць “сказаць пра зямлю”: “перш-наперш, // Дык значыць упіцца святлом, // Ад промняў вясёлых сканаць, // Пайсці пад зямлю, потым зноў // Прабіцца, як прыйдзе вясна, // Зялёнаю явай і сном” [3, с. 26].

Матыў знітаванасці чалавека з роднай зямлёй адзін з цэнтральных у творчасці А. Барскага: “Айчына – незаменная ніколі, // Найбольшы з скарбаў, дадзены нам лёсам” [3, с. 120]. Праявы радзімы ўспрымаюцца А. Барскім як паэзія (верш “Мая паэзія – мой абавязак…”; такая і назва аднаго з раздзелаў у зборніку “Лірычны пульс”). Паэт выконвае свой абавязак “перад зямлёй і перад родным словам” [3, с. 120]. Ён шчаслівы на роднай зямлі: выходзіць у поле, кланяецца ніве, шэпча словы аб шчасці чалавечым (“Стаяць паэмы і бяроз і вязаў, // Складаюцца на вечную аснову <…> Вялікаю паэзіяй ёсць поле // І чыстыя бясхмарныя нябёсы”). Лірычны герой бачыць сваё шчасце і адпаведна сваю вечнасць “у мове роднай”: “І толькі ў мове роднай я шчаслівы, // І толькі ў мове роднай буду вечны” [3, с. 120].

Верш “Пытаеш ты мяне…” – у форме маналогу, звернутага да радзімы. Аўтар выказвае пачуцці патрыятызму – адданасці, вернасці радзіме, спрабуе адказаць на пытанне, ці ён праўдзівы сын роднай зямлі або “толькі верны <…> ў слове”. У твор уключаны пералік таго, без чаго лірычнаму герою цяжка жыць: без ніваў, без залацістае пшаніцы, мёдадайнай канюшыны, громабойнай навальніцы, белавежскае дзяўчыны, а таксама яму цяжка жыць без роднай мовы. І ён глыбакадумна разважае:

Дык значыць, слова – другараднасць,
Сутнасць – у шчырай песні сэрца,
У ёй журба,
У ёй і радасць.

Як згінеш ты – яна парвецца [3, с. 32].

“Сонечнасць” творчасці і патрыятызм – галоўныя асаблівасці лірыкі А. Барскага. Яго сэнс жыцця ў тым, што ён жыў і жыве для Беларусі: “Хай рэха сто разоў // Сэнс маіх слоў паўторыць – // Аб тым што жыў я // І жыву для Беларусі” [3, с. 131].

Такім чынам, скразны матыў у творчасці А. Барскага – любоў да роднай зямлі. Паэт чэрпае натхненне з маляўнічых мясцін Белавежы, у якіх прайшло яго маленства, з фальклорных крыніц. Душа яго знаходзіцца ў палоне хараства жыцця. Ён імкнецца спасцігнуць таямніцу паэтычнага дару, вытокі натхнення, раскрыць феномен сапраўднай паэзіі. У зборніках знаходзім асэнсаванне якасцей песні, у якой і журба, і радасць. Лірычны герой А. Барскага перажывае раздвоенасць паміж зямным і нябесным. Творчы чалавек у яго мастацкім свеце асацыятыўна суадносіцца з птушкай (пералётным жоравам), коласам, пчалой, а паэзія – з пшаніцай, мёдам, хараством прыроды.

**Літаратура**

1. Барскі, А. Белавежскія матывы / А. Барскі. – Беласток : Выд-ва “Галоўнае праўленне беларускага грамадска-культурнага таварыства”, 1962. – 198 с.
2. Барскі, А. Жнівень слоў / А. Барскі. – Беласток : Выд-ва ГП БГКТ, 1967. – 195 с.
3. Барскі, А. Лірычны пульс: Вершы / А. Барскі. – Мінск : Маст. літ., 1987. – 135 с.
4. Барскі, А. Мой бераг. Вершы / А. Барскі. – Мінск : Маст. літ., 1975. – 96 с.